**Місуна, Л**. «Мы не героямі прыйшлі…» / Л. Місуна // Віцебскі рабочы. — 1991. — 27 верас. — С. 3.

## «МЫ НЕ ГЕРОЯМІ ПРЫЙШЛІ...»

Светлавалосы хлопец з блакітнымі вачыма ўважліва паглядзеў на мяне і задумаўся.

– Што засталося ў памяці ад Афганістана? – перапытаў. – У першую чаргу – боль. Я страціў там лепшага сябра – Аляксея. Сына ў гонар яго назваў. А потым... Ведаеце, мы ж не героямі туды прыйшлі, а васемнаццацігадовымі хлопчыкамі. Было незразумела і страшна спачатку. Помню, толькі-толькі прыбылі з Кабула ў часць. Вакол кроў, раненыя, град куль. Не мог зразумець, як мы даехалі да месца прызначэння. Да такога прывыкнуць нельга, але прывыклі...

Віктар Шведка праслужыў там у дэсантнай штурмавай брыгадзе два гады: з 1984 па 1986. Складаныя гады. Тады нават на ўзнагароды героям скупіліся. Але служба не надламала хлопца. У твары – прыемны спакой, а за шырокімі плячыма – упэўненасць і сіла. Такія выбіраюць шлях цвёрда, раз і назаўсёды.

– Мой бацька ўсё жыццё марыў працаваць у міліцыі. – гаворыць Віктар. – Але не атрымалася. Стаў прафесійным пажарным. А яго мара стала маёй. Два месяцы пасля службы папрацаваў на заводзе, а затым пайшоў у патрульна-паставую. Не шкадую.

– А служба ж – не мёд?

– Так, думаў, тут лягчэй, чым на вайне. А аказалася... Разумееце, узяць тую ж моладзь, маіх аднагодкаў. Хуліганства, грабяжы, крадзяжы. Напрыклад, служба ў арміі заўсёды лічылася справай гонару, не служыў – значыць, не мужчына. А сёння пасля п'яных праводзін прыходзілася ў літаральным сэнсе з ложка сцягваць навабранцаў. Сорамна і незразумела.

Моладзь не знаходзіць сабе занятку. Як такое можа быць? У мяне, напрыклад, не хапае часу: займаўся рукапашным боем, парашутным спортам. А тут скардзяцца на тое, што шаснаццацігадоваму не арганізавалі культурны адпачынак...

Нядаўна затрымалі за хуліганства непаўналетняга. Вялізны, апрануты з іголачкі. Выклікалі бацьку. «Ну, я яму, лайдаку, пакажу!». А ў аддзеле гэты лайдак гаркнуў: «Баця, глухні! Дома з табой разбяруся». І баця замоўк. Вось так і атрымліваецца: выкладуць бацькі грошыкі на штраф з уласнай кішэні, а сынок пойдзе гуляць далей. Чалавек павінен адчуваць адказнасць за кожны свой учынак, кожны крок. І закон павінен на гэта працаваць...

А зусім нядаўна сяржант, намеснік камандзіра ўзвода роты патрульна - паставой службы Наваполацкага РАУС Віктар Шведка яшчэ раз даказаў, што ў міліцыю ён пайшоў невыпадкова...

9 верасня каля дзвюх гадзін ночы аўтапатруль на вуліцы Маладзёжнай прыкмеціў САЗ-5307, які рухаўся з вялікай скорасцю. «Адкуль тут машына? Рух па вуліцы грузавому транспарту забаронены».

Паімчалі следам, дагналі. На знак жэзлам спыніцца вадзіцель рэзка павялічыў скорасць і паспрабаваў уцякаць. Машыну кідала з боку ўбок, а скорасць расла. На павароце грузавік выкінула на тратуар, а потым на лесапасадку. Маладыя бярозкі валіліся, як падкошаныя. Матор заглух. І вадзіцель, кінуўшы машыну, стаў уцякаць праз могілкі ў бок вёскі.

Шведка сарыентаваўся імгненна:

з боку ўбок Сяргей і Ігар, давайце ў абход могілак за ім.

А сам кінуўся наперарэз уцекачу. Дабег да гаражоў, якія знаходзіліся побач, і прьціснуўся да сцяны. Уцякач доўга чакаць не прымусіў. Па трэску кустоў Віктар вызначыў з боку ўбок ён дзесьці побач. І праз хвіліну той выскачыў. Прыкмеціў супрацоўніка міліцыі і рвануў у процілеглы бок.

Адлегласць яшчэ вялікая. Уцячэ! «Стой, страляць буду!». Уцякач не адрэагаваў. Віктар страляе ўверх. Той на секунду затрымаўся, спатыкнуўся і ўпаў. Вось яны, хвіліны, якія нельга ўпусціць. Бегчы заставалася метраў дзесяць. Уцякач ірвануўся ў арку між дамоў. Але Віктар ужо дабег да яго. Сілавы прыём з боку ўбок і абодва пакаціліся ў схватцы. У руцэ злачынцы раптоўна з'явіўся нож. Швыдка ўхіляецца ад удару, але клінок усё ж упіўся ў нагу. Пранізаў боль. Гэта скарыстаў злачынец і стаў зноў уцякаць. Віктар робіць рьвок следам, прыцэльваецца і, калі злачынец ускоквае на агароджу, страляе яму ў нагу...

Затрыманы аказаўся раней судзімы Ігнатовіч, які за здзейсненае злачынства знаходзіўся ў росшуку. Аўтамашына была ўгнана з вытворчага аб'яднання «Нафтааргсінтэз»…

Вось такая яна сёння, служба былога «афганца».

ў росшуку Падрасце крыху сын, і пайду вучыцца, ў росшуку гаворыць Віктар. — Цяпер складана, яму ўсяго паўтара года. Жонцы трэба дапамагчы... Хачу стаць сапраўдным прафесіяналам і стану ім.

**Л. Місуна,**
**старшы інспектар прэсгрупы УУС аблвыканкома**